

# ПЕРАЛЁТНЫЯ
# І
# АСЕЛЫЯ ПТУШКІ





**Па характару сезонных пералётаў птушкі падзяляюцца на**

*Аселых*

*Вандроўны х*

*і Пералётных*

Да ***аселых*** адносяцца птушкі, якія на працягу круглага года жывуць у адной і той жа мясцовасьці.
Некаторыя з гэтых птушак усё жыцьцё праводзяць у межах невялікай гнездавой тэрыторыі, не выходзячы за яе мяжы нават у зімовы час.
Да іх можна аднесці **вераб'я, голуба, галку і некаторых іншых птушак**.
Яны жывуць стала зблізку селішчаў чалавека. Там яны знаходзяць досыць ежы на працягу круглага года.

**Паўаселымі** завуць птушак, якія пасля выводзін птушанят выходзяць на пошукі ежы за межы сваёй гнездавой тэрыторыі і праводзяць зіму ў найблізкіх яе навакольлях.

Такія віды птушак жывуць усю зіму больш або меней асела, у адным або некалькіх пунктах. Да іх адносяцца **сарокі, крумкачы і інш.**

Паўаселасьць уласьцівая птушкам, добра забясьпечаным зімовымі кармамі.

**Вандроўнымі** завуць птушак, якія пасьля размнажэньня пакідаюць гнездавую тэрыторыю і да вясны зьдзяйсняюць бесперапынныя перасоўваньні на дзясяткі, сотні і нават тысячы кіламетраў ад сваёй тэрыторыі.

Для **вандроўных** птушак характэрныя сталыя рухі ў пошуках ежы. Кірунак рухаў у вандроўных птушак нясталы. Яны могуць неаднаразова зьмяняць напармак свайго руху але часьцей за ўсё ў бок цёплых кліматычных зон.

Да вандроўных птушак, якія жывуць у горадзе, можна аднесці **сініц, попаўзнёў, снягіроў**, ***амялушак*** *і іншых*.

**Пералётнымі** завуць птушак, якія пасьля размнажэньня пакідаюць гнездавую тэрыторыю і на зіму пералятаюць у іншыя, аддаленыя раёны.

Для пералётных птушак характэрна наяўнасьць не толькі вызначаных кірункаў і тэрмінаў пералёту, але і досыць выразна акрэсленай вобласці зімовак, у якой птушкі жывуць больш або меней асела.

Зімоўкі звычайна знаходзяцца ад месцаў гнездаваньня птушак на шмат сотняў і нават тысяч кіламетраў.
Да пералётных адносяцца большасць птушак: **дразды, качкі, гусакі, берасцянка, палявы жаўрук, кулікі, чаплі, пеначкі , валасянкі і шматлікія іншыя.**

# Як адлятаюць птушкі

- Спачатку ляцяць насякомаедныя птушкі (верасень-кастрычнік)
- Пазней ляцяць збожжаедные птушкі, а затым балотныя і водныя.
- Аднымі з першых ляцяць стрыжы.






# Як ляцяць птушкі



Журавы ляцяць клінам



Чаплі ды гусі ляцяць чарадой






# Пералёт

- Шпакі, дразды і іншыя дробныя птушкі ляцяць скучанай зграяй.
- Адны ляцяць днём

(буслы, жураўлі, драпежныя птушкі, ластаўкі, стрыжы), а іншыя ўначы (валасянкі, сітаўкі)







# Пералёт птушак

- Птушыная дарога далёкая і поўная небясьпек. Вельмі шмат птушак падчас пералётаў гіне. Толькі наймацнейшыя, самыя цягавітыя дабіраюцца да цёплых краёў.





# Аселыя птушкі нашай краіны



*Дамавы верабей - Passer* domesticus. Велічыня і аблічча агульнавядомыя. Верх галавы шэры, горла і верхняя частка грудзі чорныя, ад дзюбы праз вока да вуха ідзе карычневая паласа.

Спіна карычневая з чорнымі устаўкамі, брушка бялёсае. Самка шэра-карычневая. Засяляе вялікую частку тэрыторыі краіны. Ад палявога вераб'я адрозніваецца шэрым «капялюшыкам».



Голуб - Columba. Галубы шырока распаўсюджаныя ў нашай краіне. Сівы голуб часта жыве на дахах нашых хат. Ён прывязаны да месца, дзе нарадзіўся. Калі павезьці птушку ў іншую мясцовасьць, ён вяртаецца да гнязда. Таму людзі выкарыстоўваюць «галубіную пошту». У галубоў звычайна бывае па 2 птушаняткі ў гняздзе. Кормяць іх птушыным малаком.



Грак- велічынёй з качку. Апярэнне чорнае з бляскам. Шырока распаўсюджаны на ўсёй тэрыторыі Беларусі. Даволі лёгка вызначаецца па вонкавым абліччы.



Шэрая варона - Corvus cornix. Велічыня і аблічча агульнавядомыя. Галава, крылы і хвост чорныя, астатняе апярэнне цёмна-шэрае.



Вялікая сініца - Parus

major. Велічынёй з вераб'я. Галава, паласа уздоўж грудзі, горла, задняя частка брушка  чорныя.

Шчокі белыя. Спіна зеленаватая, ніжнія бакі цела жоўтыя, хвост і крылы блакітнаватыя. Аселая і вандроўная птушка. Шырока распаўсюджаная на тэрыторыі краіны. Гняздо ўладкоўвае ў дупле. Даволі лёгка вызначаецца па яркай афарбоўцы і адносна буйнай велічыні.



Сарока - Pica pica.
Трохі буйней за голуба. Галава, спіна, крылы і хвост чорныя. Брушка, грудзі і  плечы белыя. Хвост доўгі, ступеністы.
Голас - рэзкае стракатаньне. У прыродзе лёгка вызначаецца па характэрным абліччы.




Снягір – Pyrrhula

Велічынёй з вераб'я.
Верх галавы, крылы і хвост
чорныя.

Пёры вакол хваста  белыя, спіна блакітнавата-шэрая, брушны бок ружова-чырвоны. У самак брушны бок шэры. Аселая і вандроўная птушка. Засяляе іглічныя лясы. Гняздо будуе на дрэве.



Попаўзень - Sitta europaea.

Велічынёй з вераб'я. Спінны бок блакітнаваты, брушны бок белы, з рудымі бакамі, крылы і хвост бурыя, ад дзюбы праз вока да вуха чорная паласа, на хвасце белыя плямы. Аселая і вандроўная птушка. Засяляе лясную зону. Гняздо ўладкоўвае ў дупле. Адзіная птушка, якая можа рухацца па дрэве ўніз галавой. Адсюль і назва



Амялушка - Bombycilla garrulus. Велічынёй са шпака. Апярэнне *ружова-*шэрае. Горла і палоска ад дзюбы да вока чорныя, ілоб чырванаваты. На галаве вялікі чуб. На канцы хваста папярочная жоўтая паласа. Вандроўная птушка. Гняздо будуе на дрэве, харчуецца ягадамі і пладамі



Крыжадзюб

У яловых ды іглічных лясах узімку можна убачыць яркіх птушак з дзюбамі крыжом. Яны цяробяць шышкі, грызуць насеньне самі і кормяць сваіх птушанят, якія сядзяць у гняздзе пад густымі яловымі лапамі. Не баяцца лютаўскіх маразоў! Крыжадзюбы шукаюць шышкі і цяробяць іх, а калі іх мала, перабіраюцца ў іншыя месцы, больш ураджайныя.



Дзяцел - Piciformes.

Велічынёй з галку. Доўгая дзюба. Афарбоўка апярэньня – пярэстая. Шмат выглядаў. Ёсць

і

аселыя, і вандроўныя, і пералётныя.

Засяляе лясную зону.

Гняздо ўладкоўвае

у нары або дупле, уваход прасякае ў кары дрэва. Далёка чуваць у лесе яго грук па дрэву.



Вушастая сава - Asio otus. Твар круглы. Вочы круглыя, буйныя. Афарбоўка пёраў пярэстая. На галаве 'вушкі' з падоўжаных пёраў. Совы шырока распаўсюджаныя ў нашай краіне. Сілкуюцца рознымі грызунамі, якіх ловяць уначы.



Каралёк- самая маленькая птушка нашых лясоў. Вонкавы выгляд каралька настолькі характэрны, што пазнаць яго ў прыродзе нескладана.  На верхняй частцы галоўкі самкі шырокая жоўтая, а ў самца памяранцава-жоўтая паласа.

Спіна мае зелянява-аліўкавы колер,  а брушка - шаравата-буры. На крылах добра прыкметныя бялёсыя папярочныя палоскі. Каралёк шырока распаўсюджаны на зямным шары; ён засяляе іглічныя і змяшаныя лясы Еўропы, Азіі і Паўночнай Амерыкі.

# Цецярук



Даволі буйная птушка, велічынёй з хатнюю курыцу (маса самца - да 1,5 кг,  самкі - да 900 г). Апярэнне самца чорнае, крайнія пёры хваста загнутыя. Над вокам ярка-чырвонае брыво. Цяцерка буравата-рудая з чорным малюнкам (рабізной). Жыве ў змяшаных і іглічных лясах з высечкамі і палянамі.

# Рабчык



Памерам прыкладна з варону.
Свой назоў атрымаў дзякуючы рабой афарбоўцы.
Яна ў яго шэрая з папярочнымі рысачкамі. У самца
чорная пляма на горле і добра выяўлены хохлік.
Крылы кароткія і тупыя.  Узьлятае рабчык з шумам, лётае на невялікія адлегласьці.
Трымаюцца рабчыкі заўсёды парамі ў яловых і зьмешаных лясах. Птушка аселая, але месцамі зьдзяйсьняе кароткія кармавыя вандроўкі.

# Гульня “Ці верыце вы?”

Ці верыце вы, што некаторыя птушкі ўмеюць абслугоўваць сябе падчас ежы..?

**Так**





Вароны ня любяць чэрствы хлеб і заўсёды размочваюць яго ў лужыне перад ужываньнем





Звычайны сцярвятнік з Афрыкі бярэ ў дзюбу буйны камень і кідае яго на яйка афрыканскага страўса.

А ці верыце вы, што страўс , калі яму страшна, хавае галаву ў пясок?

**Не**

Страўс галаву закапвае ў пясок, каб пазбавіцца ад дробных насякомых, якія пасяляюцца ў пёрах.



Ці верыце вы, што гусак – гэта вельмі асцярожная птушка?



**Так**



Калі адчувае небясьпеку, то кладзецца на зямлю, выцягвае шыю і ўважліва назірае. Але як толькі небясьпека набліжаецца, то ўскоквае і ўцякае.



Ці верыце вы, што птушкі могуць правільна разьлічыць свой палёт?

**Так**



Варона - адзіная птушка, якая ўмее правільна разьлічыць свой палёт і таму ніколі, у адрозненне ад галубоў, не пападае пад машыну.

Ці верыце вы, што птушкі могуць пераймаць званкам мабільных тэлефонаў?



Дацкія птушкі сваімі крыкамі пачалі пераймаць званкам мабільных тэлефонаў. Асабліва атрымалі поспех у гэтым шпакі, якіх лічаць вельмі кемлівымі птушкамі. Адзін з супрацоўнікаў тэлекамунікацыйнай кампаніі Strand Consult з Капенгагена назваў птушку, якая жыве ў яго саду, Nokia, таму што яна вельмі спрытна перадражнівае тэлефон згаданай маркі.

**Так**

# МАЛАЙЦЫ!

